# Беларуская мова

## I КЛАС

**Для ўстаноў з БЕЛАРУСКАЙ мовай навучання**

**Кантрольнае спісванне**

### У чэрвені

У чэрвені каласуе жыта. Чырванеюць суніцы. Пахне мёдам канюшына. У большасці лясных птушак выводзяцца птушаняты. (17 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

### Ліпень

Ліпень — самы гарачы месяц. Стаяць спякотныя дні. Паспяваюць ягады. Цвіце ліпа. Пчолы напаўняюць свае соты мёдам. (17 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

### Восень

Прайшло вясёлае лета. Настала восень. Сонца свеціць не так ярка. Лісце на дрэвах пажоўкла. Не чуваць спеваў жаўранкаў. (19 слоў)

*Паводле Я. Коласа.*

## II КЛАС

**Для ўстаноў з БЕЛАРУСКАЙ мовай навучання**

**Дыктанты**

### У пачатку вясны

Ціхая раніца. У полі яшчэ ляжыць снег. Толькі пачарнелі ўзгоркі. Лужынкі за ноч сцягнуліся лядком. Але ўжо вясна ідзе. Прыляцелі з выраю шпакі. Яны спяваюць свае прыгожыя песні. Птушкі радуюцца першым дням вясны. (36 слоў)

*Паводле Я. Коласа.*

### Вясновая рабіна

Вясной рабіна распускаецца адной з першых. Як прыгожа яна цвіце! Па зялёнай кроне белымі шапкамі раскіданы пышныя суквецці. Прыемны водар ад іх чуваць за вярсту. Можна доўга стаяць і любавацца прыгажосцю рабінавых кветак. (35 слоў)

*Паводле Р. Ігнаценкі.*

Патлумачыць значэнне слова *вярста* — старадаўняя мера даўжыні, роўная 1 км 66 м.

### У полі летам

Поле пакрылася зеленню. Ужо прараслі авёс і ячмень. Цягнуцца палоскі гароху з чырвонымі і белымі кветачкамі. Відаць зялёныя стужкі лёну з сіненькімі галоўкамі. Бялее грэчка. Наліваецца жыта. Яно ціха шуміць маладымі каласкамі. Над імі ліюцца спевы жаваранкаў. (40 слоў)

*Паводле Я. Коласа.*

**Для ўстаноў з РУСКАЙ мовай навучання**

**Дыктанты**

### Мурашы

Мурашы знішчаюць шкодных вусеняў і жукоў. Яны падбіраюць смецце. Кожная мурашка цягне ў жыллё хваінку ці травінку. У лесе ёсць мурашы? Гэта добра! Такі лес будзе здаровы і чысты. (!) (30 слоў)

*Паводле Р. Ігнаценкі.*

### На лузе

Зялёнай паласой раскінуўся луг каля рэчкі. Высокая трава <u>калышацца</u> пад ветрам. Колькі тут прыгожых кветак! Пчолкі са звонам уюцца над імі. Летам так і цягне на прывольны луг! (30 слоў)

*Паводле Я. Коласа.*

Падкрэсленае слова запісаць на дошцы.

Патлумачыць значэнне слова *прывольны* — які шырока, вольна раскінуўся.

### Летам

Лета набірае сілы. Распускае вусы ячмень. Ціха шапаціць авёс. Доўгімі зялёнымі шнурамі выцягваецца бульба. Пачалі з'яўляцца блакітныя кветкі лёну. На сенажацях можна ўбачыць шмат прыгожых кветак. (27 слоў)

*Паводле П. Броўкі.*

Патлумачыць значэнне слова *сенажаць* — месца, дзе расце трава на сена; луг.

## III КЛАС

**Для ўстаноў з БЕЛАРУСКАЙ і РУСКАЙ мовамі навучання**

**Дыктант з граматычным заданнем**

### Лета

Прыйшло лета. Лісце на дрэвах вырасла ва ўвесь рост. Яно весела <u>трапечацца</u> на сонейку.

Колькі прыгожых кветак можна ўбачыць летам! Вакол іх лятаюць матылькі і пчолкі. У паветры стаіць прыемны звон ад іх крыльцаў.

Некаторыя птушкі ўжо вывелі дзетак. Крылатыя бацькі клапатліва завіхаюцца каля сваіх гняздзечак. (46 слоў)

*Паводле Я. Коласа.*

Падкрэсленае слова запісаць на дошцы.

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту словы, блізкія па значэнні да прапанаваных.
   Радасна, наступіла *(I варыянт)*.
   Гул, кружаць *(II варыянт)*.
2. Разбярыце слова па саставе.
   Матылькі *(I варыянт)*.
   Пчолкі *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   Некаторыя птушкі ўжо вывелі дзетак *(I варыянт)*.
   Лісце на дрэвах вырасла ва ўвесь рост *(II варыянт)*.

### Спеў жаваранкаў

Быў цёплы майскі дзень. З узлеску даносіўся барабанны грукат дзятлоў. На бярозе свісталі шпакі.

Раптам пачулася прыемная птушыная трэль. Гэта спявалі лясныя жаваранкі. Спачатку птушкі спявалі ціха. Але паступова іх песня набірала сілу.

Цудоўная <u>мелодыя</u> напаўняла ўсё наваколле. Так жаваранкі дружна віталі вясну. (!) (45 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

Падкрэсленае слова запісаць на дошцы.

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце слова па саставе.
   Барабанны *(I варыянт)*.
   Майскі *(II варыянт)*.
2. Вызначце лік і род назоўнікаў у сказе.
   Так жаваранкі дружна віталі вясну *(I варыянт)*.
   На бярозе свісталі шпакі *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   Раптам пачулася прыемная птушыная трэль *(I варыянт)*.
   Цудоўная мелодыя напаўняла ўсё наваколле *(II варыянт)*.

**Летні дождж**

Раптам сыпануў дождж. Буйныя кроплі заскакалі па траве. Лясныя жыхары пачалі хавацца ад ліўню. Матылькі і мухі забраліся ў чашачкі кветак. Жучкі пазалазілі ў розныя шчыліны. Маленькая мышка прытаілася пад мухаморам. Шустрыя сінічкі пахаваліся ў дуплы. Жабы скокнулі ў ваду. Усе чакалі, калі скончыцца лівень. (47 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі.*

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў апошнім сказе.

***Граматычнае заданне***

1. Вызначце часціны мовы ў сказе.
   Шустрыя сінічкі пахаваліся ў дуплы *(I варыянт)*.
   Маленькая мышка прытаілася пад мухаморам *(II варыянт)*.
2. Выпішыце з тэксту аднакаранёвае слова да прапанаванага. Абазначце ў словах корань.
   Ляснік *(I варыянт)*.
   Дажджавік *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   Жучкі пазалазілі ў розныя шчыліны *(I варыянт)*.
   Буйныя кроплі заскакалі па траве *(II варыянт)*.

## IV КЛАС

### Для ўстаноў з БЕЛАРУСКАЙ мовай навучання

<u>**Дыктант з граматычным заданнем**</u>

**Вавёрачка**

Міхаська з дзедам вярталіся з лесу. Раптам на сцяжынцы яны заўважылі вавёрку. Яна ўбачыла людзей і кінулася ў траву. Вавёрачка скакала толькі на трох лапках. Яна не дакраналася да зямлі пярэдняй лапкай.

Міхаська з дзедам прынеслі звярка дамоў. Яны змазалі параненую лапку ёдам і забінтавалі. Хлопчык пакарміў вавёрку семкамі і арэхамі.

Праз месяц ранка зажыла. Вавёрачка стала жвавай, рухавай. Міхаська аднёс яе ў лес. (65 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

***Граматычнае заданне***

1. Падбярыце з тэксту слова, блізкае па значэнні да прапанаванага.
   Заўважыла *(I варыянт)*.
   Нечакана *(II варыянт)*.
2. Разбярыце слова па саставе.
   Лапках *(I варыянт)*.
   Звярка *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   Яна ўбачыла людзей і кінулася ў траву *(I варыянт)*.
   Яны змазалі параненую лапку ёдам і забінтавалі *(II варыянт)*.

**Чый домік?**

Міша з Толікам пайшлі на прагулку ў лес. У траве пад дрэўцам яны ўбачылі круглае гняздзечка. Чый гэта домік?

Раптам пад дрэўцам зашамацела сухое лісце. Хлопчыкі прыціхлі. Хутка паказалася рыжая мышка. Яна скакала па высокай траве да гнязда. Праз хвіліну мышка заўважыла хлопчыкаў. Яна спалохана развярнулася і схавалася ў траве.

Няўжо гэта мышынае гняздо? Хлопчыкі прыгнулі сухую траву. Там яны ўбачылі маленькіх мышанят. (65 слоў)

*Паводле Р. Ігнаценкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Падбярыце з тэксту антонімы да прапанаваных слоў.
   Мокрае, смела *(I варыянт)*.
   Вялікія, зашумелі *(II варыянт)*.
2. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго час, лік і род.
   Раптам пад дрэўцам зашамацела сухое лісце *(I варыянт)*.
   Хутка паказалася рыжая мышка *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   Там яны ўбачылі маленькіх мышанят *(I варыянт)*.
   Праз хвіліну мышка заўважыла хлопчыкаў *(II варыянт)*.

**Спазніўся**

Раніцай я сабраўся ў грыбы. У сасновым бары натрапіў на палянку лісічак. Грыбы былі зусім маленькія. Я вырашыў пакінуць іх. Хай яшчэ падрастуць.

На наступны дзень я зноў прыйшоў на палянку. І што ж там убачыў? Над маімі лісічкамі шчыравалі жвавыя вавёркі. Вакол на галінках соснаў былі нанізаны рыжыя грыбочкі. Вавёркі назапашвалі іх на зіму.

Я вырашыў не трывожыць звяркоў і падаўся далей у лес. (66 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

Патлумачыць значэнне слова *шчыраваць* — старанна рабіць што-небудзь.

***Граматычнае заданне***

1. Падбярыце з тэксту антонімы да прапанаваных слоў.
   Лета, вялікія *(I варыянт)*.
   Ноч, папярэдні *(II варыянт)*.
2. Вызначце род, лік і склон назоўнікаў у сказе.
   Вакол на галінках соснаў былі нанізаны рыжыя грыбочкі *(I варыянт)*.
   У сасновым бары натрапіў на палянку лісічак *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   На наступны дзень я зноў прыйшоў на палянку *(I варыянт)*.

Над маімі лісічкамі шчыравалі жвавыя вавёркі *(II варыянт)*.

**Кладка**

За вёскай быў ручай. Аднойчы Сяргей перакінуў цераз яго дошку. Добрая кладка атрымалася. (!) Так усім было бліжэй у лес хадзіць.

Зімой Сяргей убачыў на дошцы сляды зайца. Ён прыходзіў у вёску. Вяртаўся зайчык у лес па кладцы. Другі раз Сяргей заўважыў ланцужок ласіных слядоў. Двойчы па кладцы прабег тхор. Ранкам чысціла пёркі курапатка. Яна пакінула на снезе крыжыкі сваіх слядоў.

Радаваўся хлопчык. Усе кладкай карыстаюцца! (65 слоў)

*Паводле Р. Ігнаценкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго час, лік і род.
   Ранкам чысціла пёркі курапатка *(I варыянт)*.
   Вяртаўся зайчык у лес па кладцы *(II варыянт)*.
2. Разбярыце слова па саставе.
   Ласіных *(I варыянт)*.
   Крыжыкі *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   Двойчы па кладцы прабег тхор *(I варыянт)*.
   За вёскай быў ручай *(II варыянт)*.

**Для ўстаноў з РУСКАЙ мовай навучання**

**Дыктант з граматычным заданнем**

**Страшны звер**

Дзеці разам з настаўніцай спыніліся на ўзлеску. З лесу чуўся нейкі дзіўны і нават страшны гук. Што гэта? Усе асцярожна пайшлі на гук. Праз некалькі крокаў перад імі адкрылася светлая палянка. Дзеці ўбачылі на бярозе шкляны слоік. Дзіўны гук даносіўся са слоіка. У ім гудзеў калматы чмель. Вось так часам лес палохае людзей. (!) (55 слоў)

*Паводле Р. Ігнаценкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Падбярыце з тэксту антонім да прапанаванага слова.
   Звычайны *(I варыянт)*.
   Цёмная *(II варыянт)*.
2. Вызначце лік, род і склон прыметніка ў сказе.
   Праз некалькі крокаў перад імі адкрылася светлая палянка *(I варыянт)*.
   У ім гудзеў калматы чмель *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   Дзіўны гук даносіўся са слоіка *(I варыянт)*.
   Вось так часам лес палохае людзей *(II варыянт)*.

**Ластаўкі**

Вярнулася ластаўка з далёкага выраю. Села яна на страху старога гумна і зашчабятала. Уляцела птушачка ў гумно, паглядзела на свой домік. Ён за зіму абсыпаўся, аброс павуцінай.

Прыляцела ў гумно другая ластаўка. Пашчабяталі птушкі і пачалі рамантаваць сваю хатку. Яны чысцілі яе ад пылу і павуціны. Кожны дзень насілі гліну, замазвалі дзіркі. Атрымалася ў птушак утульнае гняздзечка. (58 слоў)

*Паводле Я. Коласа.*

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы да прапанаванага. Абазначце ў словах корань.
   Шчабятуха *(I варыянт)*.
   Палёт *(II варыянт)*.
2. Вызначце род, лік і склон назоўнікаў у сказе.
   Атрымалася ў птушак утульнае гняздзечка *(I варыянт)*.
   Вярнулася ластаўка з далёкага выраю *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.
   Уляцела птушачка ў гумно, паглядзела на свой домік *(I варыянт)*.
   Села яна на страху старога гумна і зашчабятала *(II варыянт)*.

**Салдацкая крыніца**

Каля нашай вёскі салдаты былі на вучэннях. Стаяла спёка. Хацелася піць. Адзін салдат узяў рыдлёўку і расчысціў крынічку. Яна забруілася, напоўнілася да берагоў. Усе напіліся смачнай і чыстай вады. На наступны дзень салдаты зрабілі тут зруб. Нехта сплёў кошык з бярэсты і пакінуў на алешыне.

Праз тыдзень салдаты паехалі. А крыніца засталася. Уся вёска п'е вадзіцу з яе. (60 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце слова па саставе.
   Зруб *(I варыянт)*.
   Вадзіца *(II варыянт)*.
2. Вызначце род, лік і склон назоўнікаў у сказе.
   Каля нашай вёскі салдаты былі на вучэннях *(I варыянт)*.
   Нехта сплёў кошык з бярэсты і пакінуў на алешыне *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.
   Усе напіліся смачнай і чыстай вады *(I варыянт)*.
   Яна забруілася, напоўнілася да берагоў *(II варыянт)*.

*ЛІТАРАТУРА*

Вітка, В. Роднае слова : падруч. па літ. чытанні для 1-га кл. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання / В. Вітка, М. Шаўлоўская. — Мінск : Нар. асвета, 1998. — 312 с.

Вітка, В. Роднае слова : чытанка для 3-га кл. шк. з беларус. мовай навучання / В. Вітка, М. Шаўлоўская. — 5-е выд. — Мінск : Нар. асвета, 1996. — 272 с.

Галубовіч, І. І. Вавёрчыны кватаранты : апав. і казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Янка Галубовіч. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015. — 160 с.

Галубовіч, Я. Хто рукавічку згубіў? : апав., казкі : кн. для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / Янка Галубовіч. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 160 с.

Ігнаценка, Р. У зімовым садку : апав. / Р. Ігнаценка. — Мінск : Юнацтва, 1981. — 24 с.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.



*На дыску — тэксты для спісвання.*